# ГЭТА ВЯЛІКАЯ, СВЕТЛАЯ ДАТА

## З успамінаў А.М. Гузіно, в. Жукевічы

За плячыма ў Арцёма Міхайлавіча Гузіно з вёскі Жукевічы Пархімаўскага сельсавета доўгае жыццё. «Восемдзесят чацвёрты размяняў, - кажа ветэран. - Але, дзякаваць Богу, на нагах, пры памяці…» Мы размаўляем пра тое, што ў ліпені будзем адзначаць 60-годдзе вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. «Дата гэтая ўскалыхне ўспамінамі многія сэрцы, - кажа ветэран. – І тых, хто бачыў вайну, і тых, у каго яна адабрала родных...»



***А. М. Гузіно*.**

Арцём Міхайлавіч парабкаваў у Германіі, у маёнтку немца. Адчуваць сябе парабкам на чужыне, хвалявацца за бацьку, маці, братоў Івана і Аляксандра, сястру Надзю – гэта была пакута. Ведаў, якія яны, фашысты, а вёсачка Жукевічы - лясная, была пад іх пільнай увагай. У парабкоўстве даймаў голад. «Я і сёння не магу на бручку глядзець, - кажа мой субяседнік. - Гэтулькі папаеў яе варанай, што ад паху нудзіла».

- А з дому ішлі кепскія навіны, - успамінае Арцём Міхайлавіч. - Мне пісалі родныя яшчэ ў фашысцкі маёнтак, пісалі намёкамі, але я здагадваўся. Фашысты вельмі баяліся партызанаў і каралі смерцю людзей цэлымі сем'ямі. У лесе, каля нашай вёскі, жылі Карачы і Шацілы. Дык вось неяк ноччу да Карачоў завіталі «партызаны», папрасілі ежы. Тыя далі сала, хлеба. «Партызаны» аддзячылі: падарылі дабротныя боты. Назаўтра гаспадар агледзеў, што боты - нямецкія, а сала валяецца каля хаты. Значыць, гэта былі пераапранутыя фашысты. Хавацца было позна: наляцелі карнікі і, вывеўшы ўсю сям'ю ў лес, расстралялі. Уцалеў толькі малы хлопчык, які жыў тады ў цёткі.

А праз дарогу, таксама ў лесе, стаяла хата Юркі Шацілы. Ён рабіў цэглу, і ўсе называлі яго цагельнікам. Дачка яго мела сваю недабудаваную хату на лясным хутары, але жыла ў бацькі. У нежылой хаце нярэдка знаходзілі і прытулак, і ежу партызаны. За гэта і пацярпелі і Маня, і яе двое малых дзяцей, яе бацька і брат Ёзік, а яшчэ дзяўчынка, якая тады гасціла ў сям'і. Усіх расстралялі і скінулі ў бульбяную яму...

Успаміны гэтыя цяжкія для Арцёма Міхайлавіча. Але ён стараецца ўспомніць усё, бо праз нейкі час і ўспомніць не будзе каму, таму што пусцее вёска.

- У нашых Жукевічах фашысты забралі і расстралялі братоў Мікалая і Аляксея Бялевічаў, - кажа мой субяседнік. - Аляксей яшчэ блазнаваты быў, мала што пабачыў у жыцці.

Не ўсе вярнуліся ў вёску з фронту, іншых вайна дастала ужо потым.

«Уявіце, якая была людзям радасць, калі з'явіліся чуткі, што 3-га ліпеня нашы войскі вызвалілі Мінск, - гаворыць ветэран. - Потым мне вяскоўцы расказвалі, што лічылі дні, гадзіны да прыходу фронту, клаліся на зямлю і прыслухоўваліся, ці не дрыжыць яна ад кананады. І гэты юбілей - 60 год вызвалення -вялікая, светлая дата».

Пасля вызвалення з рабства нашымі войскамі ён стаў салдатам. Быў паранены ва Усходняй Прусіі, у шпіталі сустрэў Перамогу.

Марыя Драпеза, в Жукевічы,
2004 год.